**** Першая дзяржаўная ўзнагарода БССР**

Найвышэйшай дзяржаўнай узнагародай БССР у 1924—1933 гг. з'яўляўся ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР. На ордэне адлюстраваны зорка, сякера, серп, каласы, зубчастае кола. Ордэн № 1 быў уручаны таварыству «Васількі». Яго ўдзельнікі — жыхары вёскі Васількі Бялыніцкага раёна Магілёўскай акругі — вылучыліся ў асушэнні мясцовага балота. Ордэнамі таксама былі ўзнагароджаны чыгуначныя палкі, што будавалі дарогу Орша — Лепель, пагранічныя войскі БССР.

*Выкажыце меркаванне, чаму ўзнікла ідэя ўвесці ўзнагароду за працу ў выглядзе ордэна.*




Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР

1. Ахарактарызуйце палітыку індустрыялізацыі і калектывізацыі ў БССР паводле наступнага плана: а) прычыны правядзення; б) метады; в) асаблівасці правядзення; г) вынікі.
2. Дакажыце, што БССР у гады першых пяцігодак ператварылася ў індустрыяльна-аграрную рэспубліку.
3. Параўнайце ленінскі кааператыўны план і сталінскі план суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Вызначце, які з гэтых планаў дазваляў ажыццявіць ідэю паступовага добраахвотнага пераводу сельскай гаспадаркі з індывідуальнага на калектыўны характар вытворчасці.
4. Вызначце, у чым заключаўся «вялікі перелом» у вёсцы.
5. Выкажыце меркаванне, чаму калгаснікі не атрымалі пашпартоў, уведзеных у 1932 г. для грамадзян БССР.
6. Уявіце сябе ў ролі рабочага завода ці фабрыкі, пабудаваных у гады першых пяцігодак, або селяніна, які працаваў у калгасе. Якім было б ваша стаўленне да працы? Свой адказ растлумачце. Звярніцеся да метадычнай парады «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.

## § 7. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 1920—1930-я гг.

***Успомніце.*** Як змянілася тэрытарыяльнае становішча Беларусі пасля Рыжскага міру?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць працэс фарміравання беларускай савецкай дзяржавы і яе грамадска-палітычную сістэму.

**Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** У працэсе пошуку і выпрацоўкі канкрэтных формаў аб'яднання савецкіх рэспублік

Правообладатель Издательский центр БГУ

у адну дзяржаву І. В. Сталін выступіў з ідэяй «аўтанамізацыі». Згодна з ёю ўсе савецкія рэспублікі павінны былі абвясціць сябе састаўнымі часткамі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) і ўвайсці ў яе склад на правах нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Але гэты план не быў падтрыманы кіраўнікамі рэспублік, у тым ліку і Беларусі. У. І. Ленін прапанаваў больш прымальную форму дзяржаўнага ўладкавання — **федэрацыю**. Яна ўяўляла сабой саюз некалькіх дзяржаў, у якім яны падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі. У федэрацыі дзейнічаюць адзіныя канстытуцыя, органы дзяржаўнай улады, існуе адзінае грамадзянства, уводзяцца агульныя грашовыя адзінкі.

Ідэя аб'яднання была ўвасоблена ў жыццё на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў у снежні 1922 г. у Мінску. Дэлегаты з'езда аднагалосна ўхвалілі ідэю стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР). Савецкі Саюз разглядаўся як адзіная дзяржава, у якой добраахвотна на свабоднай і раўнапраўнай аснове аб'ядноўваліся ўсе савецкія рэспублікі: РСФСР, БССР, Украінская ССР, Закаўказская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка (у складзе Азербайджана, Арменіі, Грузіі) з захаваннем за кожнай з іх права свабоднага выхаду з Саюза.

30 снежня **1922 г.** дэлегацыі, якія сабраліся ў Маскве на І Усесаюзным з'ездзе Саветаў, падпісалі Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР. З'езд выбраў вярхоўны заканадаўчы орган Саюза — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР. Яго старшынёй ад Беларусі быў абраны А. Р. Чарвякоў.

**Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў** (1892—1937). Ураджэнец Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер Пухавіцкі раён Мінскай вобласці). Пасля заканчэння Віленскага настаўніцкага інстытута працаваў народным настаўнікам. Менавіта ў гэты час вызначыў мэту свайго жыцця: «Трэба аддаць усе сілы служэнню беднаму народу». Удзельнік Усебеларускага з'езда ў снежні 1917 г. Камісар Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама). Удзельнік І з'езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Яго подпіс стаіць пад Маніфестам аб стварэнні Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ). У 1922 г. удзельнічаў у рабоце па ўтварэнні СССР, у распрацоўцы планаў першых пяцігодак у БССР. У розныя гады займаў найвышэйшыя ў рэспубліцы пасады старшыні Савета Народных Камісараў і Цэнтральнага выканаўчага камітэта БССР. Стаў актыўным прыхільнікам палітыкі беларусізацыі. Карыстаўся вялікай папулярнасцю ў народзе. У Мінск на прыём, як тады гаварылі, «да Чарвякова» дабіраліся з самых дальніх куткоў Беларусі з надзеяй вырашыць надзённыя пытанні.



А. Р. Чарвякоў

*Выкажыце ўласнае стаўленне да мэты жыцця і дзейнасці А. Р. Чарвякова.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Узбуйненне тэрыторыі БССР у 1924 і 1926 гг.** Урад СССР у **1924 г.** выдаў дэкрэт аб перадачы Беларускай ССР 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, якія раней уваходзілі ў РСФСР і дзе большасць насельніцтва складалі беларусы. У выніку гэтага ўзбуйнення тэрыторыя Савецкай Беларусі павялічылася ў 2 разы — да 110 тыс. км$^2$, а колькасць насельніцтва ўзрасла амаль у 3 разы — да 4,2 млн чалавек. У **1926 г.** адбылося другое ўзбуйненне БССР. У яе склад былі ўключаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы з тэрыторыяй больш за 15 тыс. км$^2$ і насельніцтвам каля 650 тыс. чалавек. Гэта садзейнічала працэсу фарміравання беларускай нацыі, развіццю яе эканомікі і культуры.

*Карыстаючыся картасхемай на першым форзацы вучэбнага дапаможніка, вызначце суадносіны тэрыторыі Беларусі ў складзе БССР пасля ўзбуйненняў і той, якая знаходзілася ў складзе Польшчы.*

**Фарміраванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы.** Для грамадска-палітычнага жыцця 1920-х гг. стала характэрным спыненне дзейнасці палітычных партый, якія супрацьстаялі бальшавікам. У БССР замацавалася аднапартыйная палітычная сістэма. Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі (КП(б)Б) стала фактычна выконваць функцыі органа дзяржаўнай улады, які ажыццяўляў поўны кантроль над усімі сферамі жыцця грамадства. Паступова замацоўваўся безальтэрнатыўны парадак выбараў у органы ўлады, пры якім на адпаведную пасаду прэтэндавала адна кандыдатура, звычайна ўзгодненая з мясцовым партыйным кіраўніцтвам. Быць выбранымі ў органы ўлады маглі па загадзя складзеных спісах толькі члены Камуністычнай партыі або беспартыйныя, якія падтрымлівалі палітыку партыі.

Згодна з Канстытуцыяй 1927 г. палітычнай асновай БССР абвяшчаліся Саветы рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Канстытуцыя зацвердзіла назву «Беларуская Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка», абрэвіятура якой была адлюстравана на Дзяржаўным гербе, што існаваў у 1927—1937 гг.

Рэзервам і памочнікам КП(б)Б з'яўляўся Камуністычны саюз моладзі Беларусі, які пасля смерці У. І. Леніна атрымаў назву «Ленінскі» (ЛКСМБ, скарочана — **камсамол**). У гады першых пяцігодак камсамол шэфстваваў над будаўніцтвам прамысловых прадпрыемстваў, садзейнічаў правядзенню калектывізацыі сельскай гаспадаркі.



Дзяржаўны герб БССР. 1927—1937 гг.

Да канца 1930-х гг. у БССР склалася **савецкая грамадска-палітычная сістэма**. Яе асновай з'яўляліся Саветы дэпутатаў працоўных. У сацыяльна-эканамічнай галіне ўсталявалася дзяржаўная

Правообладатель Издательский центр БГУ

ўласнасць на сродкі вытворчасці, павялічылася доля рабочага класа, сфарміравалася калгаснае сялянства. У грамадска-палітычнай сферы замацавалася аднапартыйная палітычная сістэма, якая характарызавалася бясспрэчным падначаленнем цэнтральнай партыйнай і дзяржаўнай уладзе. Панавала ўсеагульная дзяржаўная марксісцка-ленінская **ідэалогія** — сістэма поглядаў і ідэй, якія адлюстроўвалі пазіцыю Камуністычнай партыі і асабіста І. В. Сталіна.

Гэта ідэалогія не сумяшчалася з рэлігійнасцю насельніцтва. Барацьба з царквой стала адной з галоўных задач савецкай улады. Быў створаны Саюз ваяўнічых бязбожнікаў, праводзілася антыцаркоўная агітацыя, забараняліся рэлігійныя арганізацыі. У час другой пяцігодкі, якую назвалі «бязбожнай», адбылося масавае закрыццё цэркваў і касцёлаў. Іх каштоўнасці і маёмасць перадаваліся дзяржаве, а самі яны адводзіліся пад сельскія клубы або ператвараліся ў склады. У 1939 г. у Савецкай Беларусі ўжо не дзейнічала ніводная царква. Святары былі пазбаўлены выбарчых правоў.



Дзяржаўны герб БССР. 1938 г.



Дзяржаўны сцяг БССР. 1937—1951 гг.

У 1937 г. была прынята трэцяя па ліку Канстытуцыя БССР. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка абвяшчалася дзяржавай рабочых і сялян. Найвышэйшым заканадаўчым органам улады з'яўляўся Вярхоўны Савет БССР. Найвышэйшым выканаўчым органам дзяржаўнага кіравання стаў Савет Народных Камісараў БССР. Абвяшчалася, што перамог сацыялістычны лад, зацвердзілася сацыялістычная ўласнасць на сродкі вытворчасці ў дзяржаўнай і кааператыўна-калгаснай формах. Прыватная ўласнасць скасоўвалася. У Канстытуцыі быў замацаваны прынцып «ад кожнага — па яго здольнасці, кожнаму — па яго працы». Савецкім грамадзянам гарантаваўся шэраг дэмакратычных правоў і свабод, у тым ліку права выбіраць і быць выбраным у дзяржаўныя органы ўлады. У 1938 г. быў зацверджаны новы варыянт дзяржаўнага герба БССР, малюнак якога перапрацаваў мастак Валянцін Волкаў. З пэўнымі зменамі герб выкарыстоўваўся да 1991 г. Таксама быў прыняты дзяржаўны сцяг БССР, які існаваў у 1937—1951 гг.

**Палітычныя рэпрэсіі.** У грамадска-палітычным жыцці СССР паступова складваўся рэжым асабістай улады І. В. Сталіна. Замацаваўся **культ асобы** — празмернае ўзвялічванне ролі Сталіна ў жыцці грамадства (**). Сярод дзяржаўных кіраўнікоў панавала сталінская тэорыя аб узмацненні класавай барацьбы па меры руху савецка-



Правообладатель Издательский центр БГУ

га грамадства да канчатковай пабудовы сацыялізму. Пачалася барацьба з праціўнікамі палітычнага курсу Камуністычнай партыі, якая мела форму **палітычных рэпрэсій** — ужывання ўладай розных мер прымусу па палітычных матывах. У гэтых умовах надзвычайна павялічылася роля органаў унутраных спраў, якім было даручана выкрываць так званых «ворагаў народа».

У выніку арыштаў рэспубліканская партыйная арганізацыя страціла амаль што палову свайго складу. За недастатковую працу па выкрыцці «ворагаў народа» быў рэзка раскрытыкаваны А. Р. Чарвякоў, які неўзабаве скончыў жыццё самагубствам. Органы ўнутраных спраў арыштавалі З. Х. Жылуновіча, а затым асудзілі да ссылкі яго жонку і дачку як членаў сям'і «здрадніка радзімы». Сам З. Х. Жылуновіч па афіцыйнай версіі памёр ад хваробы, а па іншых звестках скончыў жыццё самагубствам. Ахвярай палітычных рэпрэсій стаў М. Ф. Гікала.

**Мікалай Фёдаравіч Гікала** (1897—1937). Першы сакратар ЦК КП(б)Б у 1932—1937 гг. Актыўна праводзіў у БССР палітыку індустрыялізацыі, суцэльнай калектывізацыі, развіцця культуры. У народзе карыстаўся павагай. Нават існавала такая прымаўка: «У калгасах стала многа сала — вінават Гікала». Аднак многія з пытанняў вырашаў адміністрацыйна-каманднымі метадамі. Стаў адным з першых стваральнікаў культу асобы Сталіна ў БССР і свайго ўласнага. Быў адным з тых, хто праводзіў палітычныя рэпрэсіі, ахвярай якіх зрабіўся потым і сам.



М. Ф. Гікала з жонкай на адкрыцці Дома Урада ў Мінску ў 1933 г.

У час палітычных рэпрэсій у контррэвалюцыйныя элементы і шпіёны быў залічаны шэраг дзеячаў культуры, якія з'яўляліся прадстаўнікамі нацыянал-дэмакратычнага руху (іх называлі нацдэмамі). **Нацыянал-дэмакратызм** як кірунак грамадска-палітычнай думкі, што ўзнік у канцы XIX — пачатку XX ст., быў абвешчаны Камуністычнай партыяй варожай антысавецкай палітыкай, накіраванай супраць дасягненняў Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.

Складзеная ў 1990-я гг. электронная база звестак сведчыць, што ўсяго ў БССР у 1935—1940 гг. ад палітычных рэпрэсій пацярпела больш за 85 тыс. грамадзян Беларусі; з іх больш за 28 тыс. былі расстраляны. У 1990-я гг. палітычныя рэпрэсіі 1930-х гг. былі прызнаны неабгрунтаванымі і многія вынесеныя прысуды адменены з прычыны адсутнасці складу злачынства.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Памятны знак, прысвечаны ахвярам палітычных рэпрэсій, у Курапатах

Сімвалам палітычных рэпрэсій у Беларусі стала назва ляснога ўрочышча пад Мінскам — Курапаты. Тут у 1930—1940-я гг. адбываліся расстрэлы рэпрэсаваных. Гэта выяўлена ў выніку расследаванняў, якія праводзіліся пачынаючы з 1988 г. Пракуратурай БССР, а затым на працягу 1990—2000-х гг. Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь. У Курапатах устаноўлены памятны знак.

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё ў БССР характарызавалася, з аднаго боку, верай насельніцтва ў лепшую будучыню ў Савецкім Саюзе, а з другога — скажэннямі прынцыпаў справядлівасці і законнасці ва ўмовах замацавання культу асобы і ажыццяўлення палітычных рэпрэсій.

***Новыя паняцці і тэрміны***: *камсамол, савецкая грамадска-палітычная сістэма, ідэалогія, культ асобы, палітычныя рэпрэсіі, нацыянал-дэмакратызм.*

**** З пісьма школьніцы Ірыны Гапанёнак на імя І. В. Сталіна**

Дарагі бацька Сталін. Я дзяўчынка 10-гадовая, Ірына Аляксандраўна Гапанёнак. Хаджу ў школу ў 3-ці клас. Сёння, 7 лістапада 1940 г., вялікае свята, якое прынесла для ўсяго савецкага народа вялікую радасць. Сёння ў нашай школе ў 10 гадзін раніцы была пастаноўка для маленькіх дзяцей. І я расказвала вершык «Слава»… глядзела на твой партрэт і гучна сказала: «Слава таварышу Сталіну!» І бачыла, як усе радаваліся…

Вярнуўшыся дамоў, узяла паперу і пяро і, працягваючы да цябе сваю маленькую руку, прашу цябе, не адмоў у маёй вялікай просьбе, вярні майго тату Аляксандра Францавіча Гапанёнка, які быў арыштаваны…

…Родны бацька Сталін! Дні і гадзіны буду чакаць ад цябе адказу…

1. *Вызначце, пра якія з'явы грамадска-палітычнага жыцця сведчыць гэты гістарычны дакумент.*
2. *Уявіце сябе ў ролі вучня беларускай школы 1930-х гг. Якім было б ваша стаўленне да тагачаснай грамадска-палітычнай сістэмы? Свае адказы патлумачце. Выкарыстайце метадычную параду «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.*

1. Ахарактарызуйце ролю КП(б)Б і ЛКСМБ у тагачаснай грамадска-палітычнай сістэме.
2. Параўнайце ленінскі і сталінскі планы аб'яднання савецкіх рэспублік. Які з планаў, на вашу думку, найбольш адпавядаў інтарэсам беларускай савецкай дзяржавы?
3. Дакажыце, што ўваходжанне БССР у склад Савецкага Саюза і ўзбуйненне БССР сталі чарговымі этапамі працэсу фарміравання беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці.



Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Пра якія адметныя рысы грамадска-палітычнай сістэмы сведчыў безальтэрнатыўны парадак выбараў у Саветы дэпутатаў працоўных як у органы савецкай улады?
5. Вызначце, у чым заключаліся супярэчнасці грамадска-палітычнага жыцця БССР у 1920—1930-я гг. Выкарыстайце дадатковы матэрыял да параграфа.

# § 8. Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920—1930-я гг.

***Успомніце.*** У чым заключаліся погляды А. А. Смоліча і З. Х. Жылуновіча (Цішкі Гартнага) па пытанні беларускай дзяржаўнасці?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, якім чынам палітыка беларусізацыі і дзейнасць прадстаўнікоў навукі і культуры садзейнічалі фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці насельніцтва БССР.

**Беларусізацыя як складнік савецкай нацыянальнай палітыкі: асноўныя мерапрыемствы і вынікі.** Палітыка Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі ў перыяд з **1924** да **канца 1920-х гг.**, якая садзейнічала развіццю беларускай культуры, мовы, адукацыі, атрымала назву **«беларусізацыя»**.

**Асноўныя мерапрыемствы палітыкі беларусізацыі па развіцці беларускай мовы**

| Мерапрыемствы | Вынікі ажыццяўлення |
|---|---|
| Перавод навучання ў школах пераважна на беларускую мову | Да 1928 г. каля 80 % агульнаадукацыйных школ было пераведзена на беларускую мову навучання |
| Перавод дзяржаўнага апарату на беларускую мову | У 1927 г. каля 80 % служачых у цэнтральных установах улады валодалі беларускай мовай |
| Пераход Чырвонай Арміі на беларускую мову | У войсках, якія размяшчаліся ў Беларусі, было ўведзена вывучэнне беларускай мовы |
| Вылучэнне прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці (карэнных жыхароў) на кіраўніцкія пасады **(каранізацыя)** | Да 1927 г. доля прадстаўнікоў беларускай нацыянальнасці (карэнных жыхароў) сярод раённых кіраўнікоў павялічылася на 48 % |

Правообладатель Издательский центр БГУ